ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

'91

ЧАЦВЕР
21
ЛЮТАГА
№ 4(1668)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ВЫ ЧУЛІ?

Правы абараніць...

Створаны Савет старшыняў прафкомаў ВНУ горада Мінска. У чым асаблівасці гэтай новай арганізацыі, чым адрозніваецца яна ад звычайных прафсаюзных органаў? За тлумачэннямі мы звярнуліся да старшыні прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў універсітэта **Анатоля Васільевіча ПАЎЛАВА:**

— Савет старшыняў прафкомаў ВНУ Мінска — добраахвотная арганізацыя на базе вышэйшых навучальных устаноў нашага горада. Галоўная мэта яе дзейнасці — абарона правоў і інтарэсаў усіх, хто працуе ў вышэйшай школе.

Савет арганізаваны і дзейнічае на грамадскіх пачатках, забяспечвае роўныя правы і самастойнасць выбару для сваіх членаў. У яго планах — абмен міжвузаўскімі дэлегацыямі, стварэнне альтэрнатыўных праграм, пры неабходнасці — выказванне пратэсту супраць рашэнняў дзяржаўных, гаспадарчых і любых іншых органаў, калі яны забыліся на інтарэсы і правы прафсаюзаў.

Дарэчы, кожная прафсаюзная арганізацыя ВНУ мае права звяртацца ў новы Савет за дапамогай і абаронай.

— Хто кантралюе работу Савета?

— Савет старшыняў прафкомаў ВНУ Мінска — самастойная арганізацыя, вольная ад дыктату палітычных арганізацый, усялякіх органаў і грамадскіх рухаў. Дакументы, якімі кіруюцца члены Савета ў сваёй дзейнасці,— Канстытуцыя БССР і «Часовае палажэнне аб Савеце старшыняў прафкомаў ВНУ г. Мінска». Толькі пярвічныя прафсаюзныя арганізацыі вышэйшых навучальных устаноў маюць права патрабаваць ад Савета справаздач.

— На што могуць разлічваць прафсаюзы вышэйшых навучальных устаноў Мінска ў сувязі са стварэннем Савета?

— Перша за ўсё, на выражэнне і абарону сваіх правоў на любым узроўні, як прафесійных, так і сацыяльных. Цяпер, пры пераходзе да новых умоў гаспадарання ў нашай краіне, гэта надзвычай актуальна.

ПА САКРЭТУ УНІВЕРСІТЭТУ

Загнаных коней прыстрэльваюць?

Ну, проста не прайсці міма такой незвычайнай аб'явы. Ва універсітэце чакаецца танцавальны МАРАФОН! Але будзем спадзявацца на ўпэўненасць мастацкага кіраўніка студэнцкага клуба БДУ **Маргарыты Юр'еўны ТАРАСАВАЙ** у тым, што ў актавай зале універсітэта масавага псіхозу накшталт паказанага ў фільме «Загнаных коней прыстрэльваюць, ці не праўда?» не адбудзецца.

Даўно ўжо не было ў галоўным корпусе дыскатэк. Тым, хто знудзіўся без іх, нельга абмінуць конкурс-марафон, які рыхтуецца сумесна студэнцкім клубам і студэнцкім цэнтрам БДУ. Прычым не абавязкова стаць яго ўдзельнікам. Можна, заплаціўшы за білет гледача, патанцаваць проста для сябе.

Але ж — хто не рызыкуе.... той не атрымае 1000 рублёў. Зарабіць іх трэба ў прамым сэнсе слова потам. Першы тур конкурсу, магчыма, расцягнецца на 10 гадзін з 10-мінутным перапынкам у канцы кожнай гадзіны, другі — на 6, а трэці — на 5. Ва ўсіх турах, акрамя апошняга, удзельнікам спатрэбіцца перш за ўсё фізічная трываласць. Трэці ж тур будзе ацэньваць прафесійнае журы, улічыўшы дасканаласць касцюмаў на партнёрах і іх уменне танцаваць адпаведны танец пад кожную мелодыю, якая будзе прапанавана.

Будучым пераможцам трэба вытрымаць усе тры этапы, а потым і апошні — баль удзельнікаў марафону. Акрамя тысячы рублёў для першай пары, арганізатары конкурсу рыхтуюць суцяшальныя ўзнагароды для ўсіх, хто «датанцуецца» да фіналу, а таксама прыз глядацкіх сімпатый.

Абяцанні арганізатараў выглядаюць вельмі прывабна: у час 10-мінутных перапынкаў у марафоне яго ўдзельнікі будуць мець памяшканне для адпачынку, напіткі і бутэрброды, душавыя (пасля другога тура), а таксама магчымасць звярнуцца да медыка і масажыста (пасля другога тура). М. Ю. Тарасава лічыць, што марафон, які рыхтуецца, разлічаны зусім не на прафесіяналаў, а на самых сярэдніх танцораў.

Ну што, пабачым, хто не пабаіцца прызнаць сябе сярэднім?

ЖЫЦЦЁ ДАРАЖЭЙ

Безумоўна, тэхагляд патрабуе дадатковых клопатаў і часу: і машыну загадзя падрыхтаваць трэба, і ў ДАІ чаргу адстаяць.

Але, думаецца, усё ж жыццё даражэй. Толькі да часу мы не думаем пра гэта, а ўспамінаем тады, калі ўжо бывае позна. Мінецца бяда — і зноў ліхачым, ігнаруем знакі на дарогах і ездзім на няспраўных аўтамабілях... Зноў забіраем нечыя жыцці, пазбаўляем дзяцей бацькоў, у сясцёр забіраем братоў, у каханых — жаніхоў і нявест...

Каб менш здаралася нясшчасцяў, запрашаем уладальнікаў індывідуальнага транспарту (дарэчы, статыстыка сведчыць, што яны з'яўляюцца вінаўнікамі большасці дарожна-транспартных здарэнняў) прыгнаць свае машыны, матацыклы, матароллеры на тэхагляд. У гэтым годзе ён будзе праводзіцца ў наступныя тэрміны:

Аўтамабілі: Кастрычніцкі раён — з 1 да 17 красавіка, Ленінскі — з 18 красавіка да 16 мая, Маскоўскі — з 17 мая да 5 чэрвеня, Партызанскі — з 6 да 22 чэрвеня, Завадскі — з 24 чэрвеня да 31 ліпеня 1991 года.

Дарэчы, тыя хто пражывае ў раёнах, не названых вышэй, і будзе праходзіць тэхагляд у будучым годзе, усё роўна абавязаны ўплаціць падатак і за 1991 год.

Пры праходжанні тэхагляду ўладальнікі машын, матацыклаў, матароллераў павінны мець пры сабе ўласны транспарт, тэхнічны пашпарт (для прычэпаў), вадзіцельскае пасведчанне, медыцынскую даведку, квіток аб уплаце падатку за 1990 і 1991 гады. Калі транспартны сродак эксплуатуецца па даверанасці, квіток прадастаўляецца на імя ўладальніка транспартнага сродку.

Індывідуальныя ўладальнікі могуць правесці тэхагляд на станцыі тэхнічнага абслугоўвання. У такіх выпадках у ДАІ да пералічаных вышэй дакументаў дадаецца даведка ўсталяванага ўзору, выдадзеная станцыяй тэхнічнага абслугоўвання, талон праверкі саставу адпрацаваных газаў, транспартны сродак для зверкі нумароў агрэгатаў з рэгістрацыйнымі данымі.

Калі вы па тых ці іншых прычынах не змаглі своечасова прайсці тэхагляд, то абавязкова павінны асабіста ці праз даверауную асобу прадаставіць у ДАІ тэхнічны пашпарт і квітанцыю аб аплаце падатку з уладальніка транспартнага сродку для адпаведнай рэгістрацыі.

У. КРУМКАЧ,
старшы дзяржаўтаінспектар Маскоўскага РАУС.

АУ, ТАЛЕНТЫ!

«Беларусь — мая Радзіма»

Да нядаўняга часу стэнд гэты пуставаў — не было чаго змяшчаць на яго. Арганізатары конкурсу нават хвалявацца пачалі, маўляў, не з'явіцца, відаць, жадаючых удзельнічаць у ім. Зараз жа можна сумнявацца, ці многа іх будзе, бо першая ластаўка ўжо з'явілася. Самым смелым аказаўся студэнт III курса Аляксей **ШЫНКЕВІЧ**. Серыі яго фотаздымкаў «Поры года» і «Ад Міра да Нясвіжа» і адкрылі конкурс «Беларусь — мая Радзіма», што праводзіцца на фізфаку.

Асістэнт кафедры біяфізікі Н. А. Пракошына, якая як член партбюро займаецца работай са студэнтамі, пашкадавала, што таленты (яна ўпэўнена: яны, безумоўна, ёсць) не спяшаюцца прачынацца ад летаргічнага сну. Пакуль акрамя А. Шынкевіча асмеліўся падаць на конкурс свае работы аспірант Ігар Радзюк. Пасля адбору і невялікай дапрацоўкі з яго здымкамі змогуць пазнаёміцца ўсе студэнты факультэта.

Кажуць, калі гара не ідзе да Магамета... Успомнілі гэту прымаўку і арганізатары конкурсу і вырашылі самі шукаць таленты. Г. Р. Марозаў арганізаваў, напрыклад, нешта накшталт фотагуртка. Лепшыя здымкі, зробленыя яго членамі, будуць прадстаўлены на выстаўку. Н. А. Пракошына вырашыла звярнуцца за дапамогай да куратараў, магчыма яны падкажуць, дзе шукаць мастакоў, скульптараў, паэтаў...

Ау, таленты, адгукніцеся! Яшчэ пакуль не позна паспрабаваць свае магчымасці і атрымаць грашовую прэмію (яны чакаюць пераможцаў), а таксама стаць вядомым (не важна, што толькі на родным факультэце). На конкурс прымаюцца фотаздымкі, малюнкі, скульптура, вышыўка, макрамэ, а таксама расказы і паэтычныя творы. Падвядзенне вынікаў — красавік-май гэтага года.

ДЛЯ ТЫХ, ХТО АДСУТНІЧАЎ

І ЗНОЎ — ДАНЧЫК

...Гэты пяшчотны, лірычны голас, здавалася, ішоў з самай глыбіні душы. І не спяваў ён зусім, а выліваў свой смутак па краіне, аб якой даведаўся з расказаў бабулі і маці і ў якой так карцела пабываць. Нарэшце, усе бюракратычныя перашкоды пераадолены — і вось ён тут. Дыхае яе паветрам, любуецца незвычайнай прыгажосцю яе прыроды... Ён як бы імкнецца ўсё ўвабраць у сябе, каб потым зноў і зноў пракручваць у памяці сустрэчу з сінявокай Беларуссю. Хто ведае, ці ўдасца яшчэ калі-небудзь пабываць тут...

Не толькі Андрусішыну-Данчыку было цяжка развітацца з нашай рэспублікай, але і нам з ім. Прыйдзе на памяць тая адзіная сустрэча, на якую з цяжкасцю ўдалося трапіць, і ў табе ўжо гучыць яго шчырая мелодыя-споведзь.

У Данчыка адразу з'явіліся прыхільнікі, якія аб'ядналіся ў фан-клуб аматараў яго творчасці. Сумесна з ТБМ імя Ф. Скарыны яны вырашылі парадаваць нас яшчэ раз і запрасілі на вечарыну беларускай песні. Прысутныя паглядзелі фільм «Данчык», а таксама сустрэліся з беларускім сябрам Андрусішына-Данчыка Сяржуком Сокалавым-Воюшам, які пабываў у яго ў гасцях у ЗША.

Закончылася вечарына выступленнем «Талакі» і «Дзянніцы».

ТАНЦУЙЦЕ!

ГЭТА ПРЫГОЖА!

Нядаўні фестываль «Юная надзея-91» сабраў багата талентаў з розных гарадоў.

Калі вы не валодаеце лаціна-амерыканскай танцавальнай праграмай, выхаванцы Леаніда Апневіча з Дома піянераў Ленінскага раёна Мінска з бляскам пакажуць вам, што трэба рабіць, калі гучыць мелодыя «Джамбы» ці «Ча-ча-ча». Дарэчы, менавіта гэтыя танцоры сталі пераможцамі ў малодшай групе.

А ўсе, хто наведаўся на гэта свята, далучыліся да прыгажосці вечнага мастацтва рухаў і музыкі.

Фота С. ВАСІЛЬЕВА.

РАСКРЫВАЙ ШЫРЭЙ КІШЭНЮ

Грошы... Вось у гэтым загваздка. Не такія мы багатыя, каб боты за 300 рэ купляць. Толькі нічога не зробіш, давядзецца. А як быць студэнтам? Аказваецца, не такая ўжо і тупіковая справа, трэба толькі крышачку прадпрыймальніцтва і ініцыятывы — і грошы ў кішэні. Гэта не тое, што раней.

Мінскае ВА «Калібр» сумесна з БДУ імя У. І. Леніна, МДПІ імя А. М. Горкага, МРТІ пры ўдзеле Міністэрства народнай адукацыі БССР прапануюць вам нядрэнную здзелку. Калі справа «выгарыць», уладальнікі дзвюх першых прэмій атрымаюць па 700 рублёў, трох другіх — па 500. Будуць і заахвочваючыя прызы.

Усе вышэйпералічаныя салідныя фірмы гарантуюць нядрэнны заробак у тым выпадку, калі ў вас з'явіцца жаданне прыняць удзел у конкурсе на лепшую праграмную распрацоўку для вылічальнага комплексу «Няміга».

Для тых, хто любіць рызыку, паведамляем, што на конкурс прымаюцца навучальныя праграмы па курсу сярэдняй школы, ПТВ, тэхнікумаў, ВНУ па розных сферах вытворчай і гаспадарчай дзейнасці, гульнявыя праграмы. Галоўная ўмова — яны павінны забяспечваць павышэнне якасці вучэбнага працэсу або прафесійнай падрыхтоўкі, набыццё навучэнцамі навыкаў работы з персанальным камп'ютэрам, пашырэнне магчымасцяў прымянення КВ «Няміга» ў розных галінах вытворчай і гаспадарчай дзейнасці, сферах навукі і культуры і г. д. Нагадваем, што праграмы павінны быць распрацаваны на мовах Бейсік, Паскаль, СІ, Асэмблер.

Апісанне вашай праграмы разам з лістынгам ці дыскетай конкурсная камісія чакае да 1 мая 1991 года на адрас: 220815, Мінск, вул. Фабрыцыуса, 8, ВА «Калібр». Конкурс «Няміга».

Астатняе па тэлефонах: 25-25-52, 25-36-12.

Рэктару прысвячаецца...

Святло першага промня

Мудрэц сказаў: шаноўны погляд у мінулае — веліч народа ў будучым. Наш універсітэт прыйшоў да сямідзесяцігадовага ўзросту — часу сталасці і мудрасці, назапашаных вялікіх здабыткаў у справе развіцця навукі і асветы.

Святкаванне юбілею — гэта найлепшая пара ўспомніць яскравыя факты з біяграфіі універсітэта, расказаць сучасніку пра знакамітых людзей, якія з'яўляюцца гонарам і славай нашага калектыву. І першым у шэрагах гонару стаіць імя акадэміка УЛАДЗІМІРА ІВАНАВІЧА ПІЧЭТЫ.

Вобраз першага рэктара Беларускага універсітэта да гэтага часу застаецца загадкавым і таму вельмі прывабным у першую чаргу маштабнасцю мыслення, незвычайнымі арганізатарскімі здольнасцямі, пранікнёным адчуваннем запатрабаванняў часу. Пра яго і напісана нямала, але зусім не дастаткова, каб шматбакова раскрыць грамадскую значнасць У. І. Пічэты як нацыянальнага асветніка і грамадзяніна. Але цяпер надышоў той светлы час, каб не толькі славіць лепшае з даўно мінулага, але і ўзяць адтуль усё карыснае і вельмі патрэбнае для сённяшняга рэвалюцыйнага дня. Жыццядзейнасць акадэміка У. І. Пічэты ў гэтым сэнсе — узорны прыклад, наш нацыянальны скарб.

У сваіх шматлікіх навуковых творах ён абгрунтоўваў законы развіцця вялікіх народаў з пазіцыі гістарычнай славянскай еднасці. Гэта жыццёвае крэда вядомага вучонага вырастае з гуманістычнай дзейнасці вялікага Скарыны. Беларусь, навуковая гісторыя развіцця яе народа сталі лёсам акадэміка Пічэты. Яго прадбачанні і абгрунтаваныя вывады аб братэрскім суіснаванні народаў гучаць своечасовым папярэджваннем сучаснаму неабгрунтаванаму і пагражальнаму размежаванню.

Гэта пацвярджэнне гуманістычных поглядаў знакамітага вучонага. Каштоўныя прынцыпы агульначалавечай маралі У. І. Пічэта аздабляў сваім жыццём, грамадскай дзейнасцю, сяброўскімі адносінамі да выкладчыкаў і студэнтаў. Ён быў падзвіжнікам у поўным сэнсе гэтага слова.

Пэўна, інакш не магло і быць. Без такой інтэлігенцкай высновы і шчырай спагадлівасці не напоўнілася б дзяржаўным зместам жыццё вучонага і арганізатара вышэйшай адукацыі ў нашай рэспубліцы. Толькі таленавіты, надзелены дарам далёкага прадбачання чалавек змог рэалізаваць мару беларускага народа аб нацыянальным універсітэце.

Акадэмік Пічэта — наш першы рэктар. Шчаслівая гістарычная выпадковасць. Ён стварaў універсітэт ва ўмовах страшэннай непісьменнасці, амаль поўнай заганы беларускай мовы, і таму першая вышэйшая навучальная ўстанова стала моцным падмуркам у працэсе культурнага адраджэння.

З гэтай высновы першы рэктар універсітэта быў адным з найбольш канструктыўных дзеячоў беларусізацыі, выхавання нацыянальнай інтэлігенцыі і падрыхтоўкі кадраў для рэспублікі. Рэктар уладкоўваў універсітэт на еўрапейскі лад з улікам палітычнай і эканамічнай спецыфікі рэспублікі — агульнай адукацыі моладзі, яе нацыянальнага складу, вострай неабходнасці навуковага падыходу да развіцця сацыялістычнага грамадства. Усё, што мы маем цяпер: значныя дасягненні ў навуцы, у справе назапашвання інтэлектуальнага патэнцыялу беларускага народа — асветлена плённай дзейнасцю акадэміка Пічэты.

Патрэбна таксама пачэсна асэнсаваць мэтанакіраваную дапамогу рэктара універсітэта ў стварэнні на яго аснове іншых тэхнічных і гуманітарных вышэйшых навучальных устаноў. Гэта з'ява вельмі адметная ў агульнай канцэпцыі У. І. Пічэты аб будаўніцтве сістэмы вышэйшай адукацыі ў Беларусі.

Дык што ўяўляе сабой вобраз першага рэктара, акадэміка У. І. Пічэты? Зразумела, што гэта не ікона для малення, хоць высакароднасць заўсёды можа ачысціць душу і даць новыя сілы для жыцця і барацьбы. Але жыццё вучонага і грамадзяніна з'яўляецца яскравым прыкладам адданасці Радзіме і вялікай справе асветы, вечнага імкнення людзей да святла і свабоды.

А. СЛУКА,
дэкан факультэта журналістыкі.

БЯГУЧЫМ, РАДКОМ

Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта Уладзімір Іванавіч Пічэта (1878—1948) нарадзіўся ў Палтаве ў сям'і рэктара Віцебскай, а потым Палтаўскай духоўных семінарый. Серб па нацыянальнасці.

З 1897 да 1901 года вучыўся на гісторыка-філалагічным факультэце Маскоўскага універсітэта, дзе абараніў кандыдацкую дысертацыю пад кіраўніцтвам Васіля Ключэўскага. У 1909 годзе зарабіў магістарскую вучоную ступень і пачаў чытаць лекцыі ў Маскоўскім універсітэце. У 1911 годзе за пратэст, які ён выказаў супраць рэакцыйнага курсу Міністэрства асветы, вымушаны быў пакінуць універсітэт. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі У. Пічэта — прафесар Маскоўскага універсітэта.

У кастрычніку 1920 года Пічэта ўзначаліў камісію па заснаванню Беларускага універсітэта, а ў 1921 годзе стаў першым яго рэктарам.

Мінскае дзесяцігоддзе — адно з самых плённых у дзейнасці У. І. Пічэты. На працягу 1921—1929 гадоў ён надрукаваў каля 150 манаграфій, артыкулаў і іншых навуковых прац. Быў таксама прыкметным дзеячом дзяржаўнай і грамадскай рэчаіснасці. У 1921—1930 гг.— член ЦВК БССР. Разам з Усеваладам Ігнатоўскім, Дзмітрыем Жылуновічам (Цішка Гартны) ён шмат чаго зрабіў дзеля ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі ў Беларусі, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай беларусізацыя.

Падрыхтаваў А. ШАВЕЛЬ.

СА СТАРОЙ ПАДШЫЎКІ

ЁН ЗАСТАЎСЯ НАМ...

На гэтым фотаздымку У. І. Пічэта прыкладна ў сярэдзіне перыяду свайго жыцця, які пражыў ён дзеля Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Што можна сказаць пра першага рэктара, паглядзеўшы на адзін фотаздымак? Ці нават на дзесяць? Мабыць, самаму здольнаму фізіянамісту цікавей было б пагутарыць з Уладзімірам Іванавічам ці паслухаць меркаванні тых, каму давялося ведаць яго. Але ж першага мы пазбаўлены наогул, ды й другога амаль што таксама. Застаецца магчымасць звярнуцца да друкаваных крыніц.

«Уладзімір Іванавіч застаўся ў маёй памяці ідучым у какетліва, крыху са лба і набок надзетым капялюшы, зухавата размахваючым палачкай, з хітраватай усмешкай, што сведчылася добразычлівасцю. Нават знешне ён быў у цудоўным стылі рускага прагрэсіўнага ліберальнага прафесара пачатку XX стагоддзя...»— так успамінала пра Пічэту адна з яго вучаніц Ц. Бабіньская.

У кастрычніку 1926 года святкавалася 25-годдзе навуковай дзейнасці У. І. Пічэты. Шмат было ў тыя дні добрых слоў і пажаданняў у яго адрас. Такіх, як ад мясцовага камітэта БДУ, напрыклад: «...каб і ў далейшым Вы карысталіся тымі ж павагай і даверам, папулярнасцю і любасцю, якія Вы зусім заслужана здабылі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце». Але сярод мноства падобных паміж сабою віншаванняў з той нагоды вылучалася адно даволі незвычайнае: «Паважаны прафесар! Шчыра віншуем Вас з 25-ю гадавінаю навуковай дзейнасці і вітаем Вас як будаўніка і першага рэктара нашага універсітэта, і сардэчна жадаем Вам поўнага поспеху ў будучыне. Мы, тыя студэнты, якія па незалежных ад нас прычынах пакінуты на другі год, просім Вас у дзень гэтай вялікай урачыстасці для ўсяго беларускага студэнцтва даць нам магчымасць, не губляючы году, вучыцца далей, каб хутчэй мець магчымасць прыступіць да служэння нашай роднай Беларусі...»

Невядома, ці выканаў рэктар гэту просьбу. А тое, што яго адносіны са студэнтамі былі адначасова патрабавальнымі і дэмакратычнымі, пацвярджаюць успаміны многіх людзей, у тым ліку дачкі: «Да яго можна было папросту звярнуцца са сваімі патрэбамі. Яго любілі студэнты не толькі за цікавыя, захапляльныя лекцыі, але і за душэўныя якасці...»

Тое ж можна сказаць і пра тых, хто займаўся пад кіраўніцтвам Пічэты навуковай працай. Так, аспіранты павінны былі кожную нядзелю раніцай з'яўляцца на яго кватэру са справаздачамі аб выкананай за тыдзень рабоце.

2 сакавіка 1929 года газета «Звезда» паведамляла, што ў актавай зале педфака БДУ акадэмік Пічэта прачытае для слухачоў краязнаўчых курсаў лекцыі на тэму «Вывучэнне гісторыі Беларусі за апошнія 10 гадоў». Магчыма, Уладзімір Іванавіч чытаў свае лекцыі для такой жа публікі, якая звычайна слухала яго ва універсітэце. «Аўдыторыя нярэдка ўяўляла соценны натоўп, які стаяў сярод чатырох сцен і напружана слухаў лектара... не было крэслаў,— сведчыў адзін з тагачасных прафесараў БДУ.— У галошах, паліто, кажухах, некаторыя з паднятымі каўнерамі...»

Вельмі карціць паслухаць хоць адну з тых лекцый, няхай сабе і ў запісы. Але гэтай магчымасці час нам не пакінуў, і можна толькі здагадвацца, якім быў Пічэта-лектар. Што да сведчанняў наконт гэтага яго сучаснікаў, то некаторыя з іх пісалі ва ўспамінах, што Уладзімір Іванавіч, вельмі запальчывы чалавек у жыцці, умеў стрымліваць праявы гэтай сваёй якасці, калі чытаў лекцыі.

Звернемся зноў да беларускіх газет 20-х гадоў. У іх шматразова сустракаецца подпіс «Пічэта». Прычым у двух варыянтах. Пад яго навуковымі артыкуламі, як, напрыклад, пад гэтым — «Францішак Скарына і яго працы» («Савецкая Беларусь» за 24 і 25снежня 1925 года) — стаіць подпіс «прафесар У. І. Пічэта». Але часцей сустракаецца другі варыянт: «рэктар БДУ У. І. Пічэта». Ён марыў, каб першы універсітэт стаў цэнтрам грамадскага жыцця Беларускай рэспублікі. Таму так многа вечароў, прысвечаных славутым асобам, прайшло ў БДУ за кароткі тэрмін: віталі Купалу і ўспаміналі Багдановіча, ушаноўвалі памяць Дастаеўскага, Некрасава, Чарнышэўскага. Па той жа прычыне так часта змяшчаліся ў рэспубліканскім друку матэрыялы першага рэктара БДУ. Не толькі яго даклады на розных пасяджэннях — напрыклад, на IV Усебеларускім з'ездзе Саветаў — але і падрыхтаваныя Пічэтам спецыяльна для газет маленькія заметкі і грунтоўныя артыкулы. Так, 6 кастрычніка 1929 года ў «Звезде» з'явілася невялікая інфармацыя за подпісам рэктара БДУ «Выпускнікі апраўдаюць давер». А 5 снежня 1926 года чытачы «Савецкай Беларусі» пазнаёміліся з артыкулам «Юбілей Беларускага дзяржаўнага універсітэта — свята працоўных мас», у якім Пічэта аналізаваў умовы і вынікі пяцігадовай дзейнасці універсітэта, нацыянальны склад яго студэнтаў і перспектывы развіцця.

Падтрымка прэсы ў першага рэктара БДУ сапраўды была, і ўжо гэта дае падставы лічыць, што яго імкненне зрабіць універсітэт цэнтрам грамадскага жыцця дала плён. Буйныя рэспубліканскія газеты мелі нават рубрыку «У Беларускім дзяржаўным універсітэце» і ледзь не штодзённа змяшчалі інфармацыю. Часта ў цэнтры гэтых матэрыялаў быў рэктар. «Савецкая Беларусь» 26 студзеня 1926 года паведамляла, што У. І. Пічэта напісаў кнігу ў чатырох частках «Сялянскі рух на Беларусі», а 29 чэрвеня таго ж года інфармавала чытачоў, што да 5-ай гадавіны БДУ з'явіцца напісаная яго першым рэктарам кніга «Пяць гадоў існавання Беларускага дзяржаўнага універсітэта», якая павінна ахапіць усе бакі нараджэння і росту ўсіх факультэтаў БДУ.

Асвятляліся ў рэспубліканскай прэсе і амаль што ўсе шматлікія, трэба адзначыць, замежныя камандзіроўкі рэктара Пічэты. У снежні 1925 года дэлегацыя БДУ на чале з ім ездзіла ў Познань на з'езд польскіх гісторыкаў («Савецкая Беларусь» за 3.12.1925 г.). У чэрвені 1927 года адбылася паездка Пічэты з навуковымі мэтамі ў Варшаву, Берлін і Прагу («Звезда» за 7.06.1927 г.). Тады ў Празе Уладзімір Іванавіч прачытаў два даклады аб культурным будаўніцтве ў БССР у таварыстве збліжэння Чэхаславакіі з новай Расіяй і ў беларускай савецкай калоніі. А ў жніўні 1928 года Пічэта быў запрошаны ў Осла на міжнародны кангрэс гісторыкаў («Звезда» за 9.08.1928 г.).

...Каб сабраць усе гэтыя пажаўцелыя старонкі старых газет і знайсці захаваныя там карысныя парады Пічэты, яго абяцанне абавязкова прыйсці на сустрэчу з намі ў хуткім часе і яго ўпэўненасць, што ўсё будзе добра...

В. БЯГУН.

«Мне не давялося ні бачыць, ні чуць Пічэту»

Ён узначальваў кафедру гісторыі паўднёвых і заходніх славян у Маскоўскім універсітэце і памёр за тры месяцы да таго, як я стаў студэнтам МДУ. Я адкрыў яго для сябе ў 1947 годзе ў яго працах. Адной з першых кніг, набытых мной у студэнцкія гады, была «Гісторыя Чэхіі», якую захоўваю па сённяшні дзень. Яна была напісана з удзелам і пад рэдакцыяй акадэміка У. І. Пічэты.

У памяці захавалася адчуванне той пякучай цікаўнасці, з якой я яе чытаў. Інтарэс да гісторыі славян быў у пасляваенныя гады асабліва прыкметным. Сумесная барацьба славянскіх народаў супраць германскага фашызму ўмацавала ідэі славянскай салідарнасці. Мы з усё большай надзеяй глядзелі на будучыню краіны і свету.

Пасля заканчэння універсітэта маё жыццё аказалася звязаным з Беларуссю і Беларускім універсітэтам. Тут я зрабіў сваё другое адкрыццё У. І. Пічэты. Для мяне нечаканым з'явілася тое, што сусветна вядомы акадэмік У. І. Пічэта і першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта — адна і тая ж асоба. Але самае блізкае знаёмства з Пічэтай стала магчымым пасля звароту да яго прац, цяпер ужо з мэтай навуковага аналізу таго ўкладу, які быў зроблены Пічэтай у вывучэнні праблем беларускай, старажытнарускай і раннеславянскай гісторыі, якія цікавілі мяне.

У. І. Пічэта быў вучоным у самым высокім і высакародным сэнсе гэтага слова. Прыезд яго ў Беларусь і прызначэнне першым рэктарам першага ў гісторыі Беларусі універсітэта былі зусім не выпадковымі. У 1918 годзе ў Беларускім народным універсітэце ў Маскве ён прачытаў курс лекцый па гісторыі Беларусі, які хутка быў надрукаваны пад назвай «Гісторыя беларускага народа». Хоць гэта работа была разлічана на масавага чытача, «усе чыталі гісторыю свайго народа ўпершыню»,— адзначаў выдатны гісторык Беларусі Н. Н. Улашчык. У год прызначэння рэктарам У. І. Пічэта апублікаваў кнігу «Гісторыя Літоўскай дзяржавы да Люблінскай уніі».

Дзевяць гадоў знаходзіўся У. І. Пічэта на пасадзе рэктара БДУ. У 1930 годзе ён быў абылганы і арыштаваны. Чыстая выпадковасць захавала яму жыццё, і ён у 1935 годзе вярнуўся да навуковай дзейнасці, але ўжо не ў Беларусі.

Работа ў БДУ была плённай для яго як даследчыка. Агульнапрызнана, што ён стаў заснавальнікам гістарычнай навукі ў рэспубліцы. У цяжкія дваццатыя гады, гады станаўлення універсітэта, з масай рэктарскіх клопатаў, якія выпалі на яго долю, ва ўмовах ідэйна-палітычнай барацьбы, што не спынялася, У. І. Пічэта зрабіў надзвычай многа. Навука была справай яго жыцця, і ён не мог без яе. Варта здзіўлення, як здолеў ён зрабіць за гэты кароткі тэрмін так многа. Пералічу далёка не ўсе надрукаваныя ім за гэты перыяд працы: «Гісторыя сялянскіх хваляванняў у Расіі», «Гісторыя Беларусі. Ч. 1», «Эпоха гарадской гаспадаркі ў Беларусі», «Скарыніяна», «Уводзіны ў рускую гісторыю», «Полацкая зямля ў пачатку XVI стагоддзя», «Беларускае адраджэнне ў XVI стагоддзі», «Багдановіч як гісторык беларускага адраджэння», «Гісторыя сельскай гаспадаркі і землеўладання на Беларусі. Ч. 1», «Гістарычныя лёсы Заходняй Беларусі», «Асноўныя моманты ў гістарычным лёсе Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі».

Чым растлумачыць такую высокую выніковасць? Асабліваым талентам, добрай школай, умелай арганізацыяй працы ці асаблівымі ўмовамі для рэалізацыі навуковага патэнцыялу вучонага? Думаецца, што ўсімі гэтымі фактарамі разам.

Рост нацыянальнай самасвядомасці ў значнай ступені спрыяў тады празе да атрымання гістарычных ведаў. Нябачны размах набыў краязнаўчы рух у рэспубліцы. У 1925 годзе быў утвораны краязнаўчы гурток у БДУ, які перарос у студэнцкае краяведчае таварыства. У. І. Пічэта, рэктар універсітэта, стаў яго старшынёй. Высокі аўтарытэт рэктара ў немалой ступені садзейнічаў таму, што ў невялікім тады яшчэ па колькасці студэнтаў універсітэце, дзе не было яшчэ і гістарычнага факультэта, на курсах краязнаўства займалася больш за 200 чалавек. Зараз мы не можам сабраць са студэнтаў па 10 капеек на рэстаўрацыю і ахову помнікаў гісторыі і культуры нашай рэспублікі...

Прызнаны даследчык, У. І. Пічэта заставаўся ўдзячным вучнем. Ён шанаваў сваіх настаўнікаў. Да канца жыцця быў верны аднаму з іх — вучонаму-славісту М. К. Любаўскаму. Высокая інтэлігентнасць У. І. Пічэты — адна з рысаў яго асобы.

У. І. Пічэта быў вельмі дэмакратычны і даступны. Газеты таго часу расказваюць, што рэктар дапамагаў расстаўляць мэблю ў аўдыторыях універсітэта.

Я адчуваю гонар за нашага першага рэктара. Яго вобраз асацыіруецца ў мяне з тым укладам, які ўнеслі гісторыкі ў станаўленне універсітэта. Яго выдатная асоба з самага пачатку надала Беларускаму універсітэту вобраз сучаснай арыгінальнай вышэйшай навучальнай установы, якая адказвала самым высокім стандартам таго часу.

Э. ЗАГАРУЛЬСКІ,
дэкан гістарычнага факультэта.

ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ АДПАЧЫНКУ

ЯК КАНІКУЛЫ ПРАЙШЛІ?

Цяжка адказаць на гэта пытанне адным словам, нават канкрэтнаму студэнту, а тым больш, калі паспрабаваць уявіць сабе агульную карціну адпачынку ўсіх, хто вучыцца ў БДУ.

Зыходзячы з даных студэнцкага прафкома, сярод нашых студэнтаў больш дамаседаў, чым аматараў падарожжаў. З разнастайных пуцёвак, якія атрымаў прафсаюзны камітэт напярэдадні канікулаў, толькі на горныя турбазы, у Дом адпачынку «Нарач» і ў бясплатны Дом творчасці ў Рузе, што пад Масквой, усе былі задзейнічаны. Санаторый «Трускавец» студэнты праігнаравалі, Дамы адпачынку «Пухавічы» і «Лясныя азёры» амаль што таксама. Больш папулярнымі аказаліся турыстычныя цягнікі: у Ленінград, Рыгу, па «Залатым кальцы», «Львоў — Ужгарад — Мукачава» і «Адэса — Херсон — Севастопаль — Феадосія». Але ў кожным выпадку супрацоўнікам прафкома прыйшлося вяртаць частку пуцёвак у абком прафсаюзаў.

Між тым, аналагічная гісторыя здараецца штогод. Цяжка зразумець, чаму далёка не ўсіх студэнтаў вабіць магчымасць заплаціць усяго 30 або 50 працэнтаў ад кошту падарожжа і адначасова гарантаваць сабе, акрамя новых уражанняў і знаёмстваў, тое, з чым цяжка сёння ў нас,— ежу і начлег. Пэўна, тут хаваецца значны далягляд для даследаванняў і псіхолагаў, і сацыёлагаў.

А, можа, адказ больш просты. Паспрабуем даць яго з дапамогай дзвюх студэнтак. Адну завуць Наташа, а другую — таксама Наташа. У іх сёлета былі апошнія ў жыцці студэнцкія канікулы. Дзяўчаты так старанна чакалі іх, такімі моцнымі прадчуваннямі былі апантаны, што не заўважылі, як канікулы наблізіліся. Так хацелася запомніць іх на ўсё жыццё!

Кінуліся Наташы ў прафком сваёй ВНУ. На жаль, гэта быў Інстытут культуры, а не БДУ — бо тут ім тоесёе прапанавалі б. А ў «альма матэр» для дзяўчат на той час нічога ўжо не засталося. Ніводнай пуцёўкі. Прыйшлося ім ехаць у гарадское турбюро. Там такі выбар: двухдзённае авіяпадарожжа ў Ленінград за 127 рублёў і два турыстычныя цягнікі — у Крым і на Карпаты, за 145 і 160 рублёў адпаведна. Успомнілі студэнткі, што маюць права на ільготны праезд, і вырашылі, што гэта не вельмі зайздросны выбар для іх, людзей неграшоўных.

Нарэшце, адна Наташа вырашыла паехаць у Ленінград, — ёй было ў каго пераначаваць там. А другая выбрала свой любімы горад Адэсу, дзе мае сяброў.

Вярнуўшыся са сваіх падарожжаў, дзяўчаты не забыліся расказаць нам аб іх...

«Белая варона» пад снегам...

...У ЛЕНІНГРАДЗЕ

Ён не на крайні выпадак — чароўны горад Ленінград. Да сустрэчы з ім трэба рыхтавацца загадзя або быць гатовым усё жыццё...

Зычу падарожжа ў Піцер — Пецярбург — Петраград — Ленінград таму, хто імкнецца скарыстаць вольны час для сустрэч, якія не абмежаваны стагоддзямі, для думак і пачуццяў, якія ў вышыні сваёй не спыняюцца; таму, хто жадае адчуць моцную прагу да створанага класікамі — Пушкіным, Дастаеўскім, Гогалем...

З апошніх турыстычных даведнікаў амаль што зніклі мясціны, звязаныя з рэвалюцыйным мінулым, застаўся там у асноўным стары Пецярбург. Але сённяшняя рэчаіснасць часцей напамінае Петраград 17-га года, чым горад рускіх цароў.

У 5 гадзін раніцы людзі займаюць чэргі за мясам, яно толькі па «візітках». Прыезджыя могуць купіць хлеб, малако, садавіну — калі гэта ёсць у продажы.

Прагулка нават па самых непаўторных вуліцах Ленінграда не вабіць — па прычыне не 20-градуснага мароза, а з-за бясконцасці там сумных і заклапочаных чалавечых твараў.

Усё астатняе, галоўнае, ужо не ў Ленінградзе, а наогул у нейкім іншым свеце.

Упэўнена, што такі велічны горад павінен аказваць нейкі асаблівы ўплыў на сваіх жыхароў. Ленінградцы здаюцца мне асобнай чалавечай фармацыяй. Хоць выпала на яе долю і блакада, і вялікая міграцыя насельніцтва, і сённяшнія прадуктовыя карткі. Сапраўдных ленінградцаў усё роўна можна распазнаць, нават у стракатым натоўпе на Неўскім. Штосьці ёсць у іх тварах такое... А яшчэ яны ў большасці сваёй вельмі ветлівыя людзі. З іх горадам не бойся знаёміцца сам-насам, без спадарожнікаў. І таму, што яго цікавейшая частка «трымаецца разам» — амаль усе славутасці размешчаны побач. І таму, што ленінградцам прыемна задаваць пытанні. Нават заблудзіць тут прыемна: ахвотна падкажуць выйсце, падрабязна растлумачаць усё і праводзяць, хоць спяшаюцца ў іншы бок.

На Дварцовай плошчы — вялікі выбар экскурсій. Усяго за рубель і 80 капеек я пабывала на дзвюхгадзіннай экскурсіі па старому Пецярбургу. На тралейбусе мы праехалі па Неўскім і Старанеўскім праспектах, пабывалі на Васільеўскім востраве. У славутыя прыгарады Ленінграда запрашаюць на Дварцовай плошчы кааператары, не менш, чым за 14 рублёў. А білет на электрычку ў тым жа напрамку каштуе для студэнтаў капеек 10. І я вырашыла трапіць у горад Пушкін без дапамогі кааператараў.

Царскасельскі ліцэй «бярэ» са студэнцкай кішэні ўсяго 30 капеек, Екацярынінскі палац — 90. Наўрад ці кааператары дапамаглі б мне ўбачыць сад і скульптуры каля гэтага палаца: зімой скульптуры ўбіраюць, а сад голы зусім. Вялікія эмоцыі — не ўзнагарода за вялікія грошы.

Маё спатканне з Ленінградам скончылася праз 4 дні. За гэты час я паспела пабываць, акрамя Пушкіна, у Эрмітажы і Меншыкавым палацы, у Рускім і Заалагічным музеях, а таксама ў музеі антрапалогіі і этнаграфіі. Увесь час было адчуванне, што студэнтаў і школьнікаў паўсюдна чакаюць з абдымкамі. Кожны студэнцкі білет у музей — 50-працэнтны. У Эрмітажы спецыяльна для навучэнцаў арганізавана некалькі тэматычных абанементаў на цыкл экскурсій. Рускі музей прапанаваў выстаўку В. М. Васняцова і экспазіцыю «Палацы Пецярбурга». Супрацоўнікі гэтага музея пазбаўляюць адпачываючых студэнтаў напамінку аб лекцыях выкладчыкаў: тут экскурсавода можна слухаць не «жыўцом», а праз плэйер.

Але — цяжкая гэта праца, хадзіць па музеях і нават проста гуляць па гораду, скажу я вам шчыра. У канцы дня так баляць ногі і ные спіна, як пасля добрых фізічных нагрузак. Можа, таму так многа сярод студэнтаў дамаседаў?

...У АДЭСЕ

Адэса. Здаецца, у самім слове жыве лета. Госці горада, толькі з'явіўшыся ў аэрапорце, пачынаюць «шукаць» у паветры пах мора.

...Я ўпершыню тут разам з зімой. І ўпершыню ў гэтым годзе. Чароўная лічба — 1991, рыхтуе нам нешта незвычайнае, калі меркаваць па пачатку года і па таму, што ў 1990-м Адэса яшчэ была іншай. Няўжо змянілася гэтак жа імкліва, як цэны на яе «Прывозе», што імгненна падскочылі ў два-тры разы?

Яшчэ больш з'явілася на адэскіх вуліцах «Мерседэсаў», «Фордаў» і іншых «замежных сяброў». А зіма надзела першых жанчын горада ў такія шыкоўныя футры, якія іншай рэакцыі, акрамя боязі за жыццё іх уладальніц, не выклікаюць. У той жа час, адэскія жабракі сталі выглядаць яшчэ больш па-жабрацку. У Мінску такіх і не сустрэнеш, бо няма ў нас «адэскага капіталізму», які больш жорстка, чым наша рэчаіснасць, размяркоўвае людзей па сацыяльных прыступках. Порт побач. Разам з марскім паветрам ён забяспечвае Адэсу імпартнымі таварамі для славутага «талчка», казачнымі цэнамі на ўсё, што прывозяць для продажу маракі, і ўражальнымі кантрастамі, якія трапляюцца літаральна на кожным кроку.

Сапраўднага снегу, які не растае, толькі кануўшыся зямлі, у Адэсе не бачылі даўно. Ну і дзякуй яму. Ён, быццам, для таго і выпаў, каб стаць сховішчам для рознага роду «белых варон», такіх, як прыезджыя, напрыклад. Хіба ж разумна гасціць у Адэсе зімой? Вятры тут студзёныя — з мора. Прадуктаў небагата, і за купоны. Сябры, калі ёсць яны, падзеляцца гэтымі цудадзейнымі паперкамі, вельмі падобнымі на нашы беларускія талоны. Але так няёмка прасіць купон з кожнай нагоды. Ну, бедную зімовую садавіну можна толькі за грошы купіць, ну, хлеб, зразумела, таксама, а ў некаторых магазінах нават малако (астатнія малочныя прадукты ў Адэсе амаль што такія ж рэдкія, як снег). Ласункі «купонныя», акрамя хіба што тортаў, якія ўжо «перайшлі да рынку» — менш, чым 6 рублёў не каштуюць...

Карацей, апранайся пацяплей і бяжы на сустрэчу з морам. Няўжо ж і на ім адбіліся апошнія перамены, наладжаныя людзьмі? Знаёмы пляж непазнавальны ў зімовым убранні. Цішыня і адзінота. Некалькі пажылых людзей дыхаюць марскім паветрам, пэўна, яны з бліжэйшых санаторыяў, якія толькі ўзімку ім і даступныя.

Мора не замярзае! Яго бераг такі ж мяккі, як пад пякучым летнім сонцам — здаецца, скінеш абутак і адчуеш гарачыню. Цуд нейкі: снег тут не ляжыць роўным пластом, а, толькі выпаўшы, перамешваецца з прыбрэжным пяском. Не, мора тое ж. Жыццёвыя буры — не яго хваляванні. Яно заспакойвае ўпэўненасцю, што застанецца і нашаму лёсу нешта вечнае і нязменнае...

...Адэса нікому не дазваляе лёгка закахацца ў сябе — вельмі яна своесаблівая дама. Раптам прадставіць твайму погляду бясконцы рад старых і брудных двароў і падваротняў, падобных на трушчобы. А летам не пусціць у мора, закрычаўшы з усіх пляжных гучнагаварыцелаў: «Купацца небяспечна! Забруджанасць вады перавышае норму!» Або напомніць, што ў ёй цяжка знайсці кватэры і гасцініцы без тараканаў. Кінешся ад усяго гэтага ў аэрапорт: хутчэй дадому, хутчэй. Але ўжо ў паветры раптам так закарціць адчуць подых мора... Адразу захочацца і агульнай панарамы порта з Прыморскага бульвара, і непаўторнага настрою Пушкінскай вуліцы, і адзінага ва ўсім свеце адэскага акцэнта паміж бяскрайнімі радамі непадражальнага «Прывоза»... Немагчыма не закахацца ў гэтую капрызную даму Адэсу!

Яна сама такая ж «белая варона», як яе зімовы госці, і нават снег не можа схаваць яе нетрадыцыйнае апярэнне.

Падрыхтавала В. БЯГУН.

ПАСЛЯСЛОЎЕ

26 студэнтаў БДУ сустрэліся на мінуўшых канікулах са славутасцямі «Залатога кальца». Не выявіць, для каго з іх гэта падзея выдалася найбольш эмацыянальна насычанай. Затое можна сцвярджаць, што самай карыснай яна павінна быць для студэнтаў гістарычнага факультэта Аляксея Багдановіча, Аляксандра Лапаціна і Івана Рака. Сапраўдныя помнікі старажытнасці — звышкаштоўны дадатак да старонак падручніка па гісторыі СССР. Фота А. ГУСАКА.

СЛУЖБА 03

Грып — вораг мой

Грып — гэта вострае інфекцыйнае захворванне віруснай прыроды, якое перадаецца чалавеку паветрана — капельным шляхам і характарызуецца таксікозам, ліхаманкай, выбарчым паражэннем органаў дыхання.

Узбуджальнікам грыпу з'яўляюцца тры тыпы вірусаў, якія абазначаюцца літарамі лацінскага алфавіту ў парадку адкрыцця: А. В. С. Крыніца інфекцыі — хворыя з выражанымі і сцёртымі формамі захворвання. Заразны перыяд працягваецца да 4—7 сутак ад пачатку захворвання.

Грып пачынаецца нечакана з дрыжыкаў, рэзкага павышэння тэмпературы цела да 39—40 °, з'яўляецца агульнае недамаганне, закладзены нос, насмарк, кашаль, пяршэнне ў горле, болі пры глытанні, ускладняецца дыханне, з'яўляецца рэзкі галаўны боль, а таксама боль пры руху вачэй, галавакружэнне, слабасць, вялікая патлівасць. Востры перыяд працягваецца 2—3 дні, потым праявы хваробы паступова знікаюць і, калі не далучаюцца ўскладненні, чалавек хутка становіцца працаздольным. Часам грып можа працякаць сцёрта пры лёгкім насмарку і невялікім галаўным болі, таму сярод часткі насельніцтва існуе думка, што грып не небяспечнае, лёгкае захворванне. Гэта думка памылковая. Хвароба рэзка зніжае супраціўляльнасць арганізму, стварае спрыяльныя ўмовы для ўзнікнення ўскладненняў. Яны ўзнікаюць у выніку мікробнай інфекцыі, якая далучылася, або як абвастрэнне хранічнага захворвання, якое раней мучыла хворага, напрыклад, рэўматызм, гайморыт. Найбольш часта пры грыпе здараецца запаленне сярэдняга вуха, лёгкіх, ангіна, паражэнне сардэчна-сасудзістай сістэмы ў розных праявах.

Чалавек, які заўважыў у сябе прыкметы хваробы, павінен адразу звяртацца да ўрача. Правільнае выкананне назначэнняў і рэкамендацый урача забяспечыць хвораму хутчэйшае выздараўленне і папярэдзіць узнікненне ўскладненняў. Калі ж хворы, пераадольваючы немач, працягвае працаваць (займацца) і знаходзіцца ў калектыве, то гэтым ён шкодзіць не толькі сабе, але і акружаючым яго людзям, вылучаючы пры размове, кашлі і чыханні з кропелькамі слюны і слізі вялікую колькасць віруса. Своечасовая ізаляцыя хворага з'яўляецца асноўным фактарам, які папярэджвае распаўсюджванне інфекцыі. Добра вядома, што лячыць любую хваробу значна цяжэй, чым папярэдзіць яе ўзнікненне.

Прафілактыка грыпу складаецца з агульных і спецыяльных мерапрыемстваў. Агульныя прафілактычныя мерапрыемствы складаюць аснову барацьбы з грыпам, а спецыяльныя (медыцынскія) іх істотна дапаўняюць.

Прафілактыка грыпу перш за ўсё садзейнічае выкананню агульных санітарных і гігіенічных патрабаванняў па ўтрыманню ўсіх памяшканняў (дастатковая плошча, аптымальная тэмпература і вільготнасць, сістэматычнае праветрыванне, рэгулярная і правільна праводзімая вільготная ўборка). Не менш важна і захаванне мер уласнай гігіены: акуратнае мыццё рук з мылам перад ядой, выкарыстанне толькі індывідуальных рушнікоў, насовак, зубных шчотак і г. д. Асабліва строга патрэбна захоўваць правілы асабістай і грамадскай гігіены ў неспрыяльныя па грыпу перыяды, перад надыходам эпідэміі і ў час яе ці ў час успышкі захворвання.

Адным з важных мерапрыемстваў прафілактыкі грыпу з'яўляецца загартоўванне арганізму. Мэта яго — прывучыць чалавека лёгка пераносіць неспрыяльныя ўздзеянні знешняга асяроддзя (холаду, высокай вільготнасці, дажджу, ветра). Разам з тым загартоўванне ўмацоўвае здароўе і павышае супраціўляльнасць арганізму да любых захворванняў. Чым чалавек мацнейшы, тым больш паспяхова ён супраціўляецца грыпу.

Кожнаму студэнту неабходна выконваць шэраг мер па загартоўванню — штодзённае абціранне або абліванне цела прахладнай, а потым і халоднай вадой. Усё гэта патрэбна рабіць сістэматычна і рэгулярна.

Разам з загартоўваннем неабходна пазбягаць і рэзкага ахаладжэння. Адзенне і абутак павінны заўсёды адпавядаць сезону, надвор'ю і роду дзейнасці.

Г. ГАЛЬЧАНЮК,
Г. ГОЗЕНРУД,
урачы.

ДЗЕЛАВОМУ ЧАЛАВЕКУ

Малое прадпрыемства «АКТЫЎ БДУ» аб'яўляе аб пачатку сваёй дзейнасці. Створанае ў складзе НДЧ універсітэта, яно з'яўляецца дзяржаўным прадпрыемствам і прапануе наступныя паслугі на выгадных умовах:

— выкананне і ўкараненне навукова-тэхнічных распрацовак;

— маркетынг, рэклама навукова-тэхнічных дасягненняў;

— фарміраванне часовых творчых калектываў для выканання НДР і АКР:

— суправаджэнне і забеспячэнне выканання НДР;

— камерцыйнае распаўсюджванне вынікаў распрацовак з дапамогай продажу ўзораў, дакументаў, патэнтаў, ліцэнзій, ноўхау.

Чакаем Вашых прапаноў:
тэл. 20-74-65, НДЧ, «АКТЫЎ БДУ».

СТУДЫЁН

Час — рэч дыфіцытная. Але нягледзячы на тое, што яго амаль заўсёды не хапае, выкладчыкі і супрацоўнікі ўсё ж не забываюць клапаціцца пра сваё здароўе, і нярэдка іх можна сустрэць у спартыўнай зале на трэніроўках. Найбольш настойлівыя і рашучыя спрабуюць свае сілы ў спаборніцтвах па розных відах спорту. Нядаўна вызначаны лепшыя каманды па баскетболу, валейболу і настольнаму тэнісу ў праграме Спартакіяды «Здароўе» сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

УСЕ ЎЗРОСТЫ ПАДУЛАДНЫ

БАСКЕТБОЛ

Заяўкі на ўдзел у спаборніцтвах паступілі ад сямі камand: хімічнага, механіка-матэматычнага, фізічнага, радыёфізічнага факультэтаў, ФПМ, НДІ ЯП і ваенная кафедры. Як прызналася трэнер-выкладчык Галіна Міхайлаўна Лобач, такой масавасці яна не чакала. Нельга сказаць, што ўсе каманды выступалі аднолькава роўна, таму былі, як звычайна, пераможцы і пераможаныя. Найбольш пашанцавала баскетбалістам факультэта радыёфізікі і электронікі, НДІ ПФП і хімічнага факультэта, якія занялі адпаведна першае, другое і трэцяе месцы.

ВАЛЕЙБОЛ

У жанчын за тры прызавыя месцы вялі барацьбу... тры каманды. Найбольш удала выступілі жанчыны вылічальнага цэнтра, на другім месцы — валейбалісткі факультэта радыёфізікі і электронікі і на трэцім — ФПМ.

У мужчын перамога была не такой лёгкай, бо лепшых трэба было выбіраць з шасці зборных. Імі сталі фізікі, матэматыкі (ФПМ) і географы — пералічаны ў тым парадку, якую прыступку п'едэсталу гонару яны занялі.

НАСТОЛЬНЫ ТЭНІС

Так-так, знаёмыя ўсё твары. Зноў паказалі сябе НДІ ПФП (першае) і геафак (другое месца). Аказваецца, ёсць у нас і нядрэнныя тэнісісты, а не толькі валейбалісты і баскетбалісты. Не менш узрадавала суддзяў і «бронза» ваеннай кафедры. Дарэчы, яны ў гэтым годзе даволі шматабяцаюча пачалі свае выступленні і не прапускаюць амаль ніводнага віду.

ЗАПРАШАЕМ НА АЛІМП

Узнагарода абавязвае

Хоць, як кажуць, БДУ не Інстытут фізічнай культуры тым не менш і ў нас са спортам не так ужо і дрэнна. І мы таксама маем вядомых спартсменаў. Аб гэтым сведчыць і нядаўняя ўзнагарода, якая папоўніла калекцыю спортклуба БДУ.

Дзяржкамітэт БССР па фізічнай культуры і спорту, Міністэрства народнай адукацыі рэспублікі і Беларускі рэспубліканскі савет Усесаюзнага добраахвотнага фізкультурна-спартыўнага таварыства прафсаюзаў узнагародзілі Ганаровай граматай Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна, які заняў другое месца ў Спартакіядзе спортклубаў ВНУ рэспублікі 1990 года сярод вышэйшых навучальных устаноў першай групы.

Узнагарода, як вядома, абавязвае. Так што ёсць надзея стаць прэтэндэнтам на першае месца.

М. КУЧЫНСКІ,
старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

Даўно не праходзілі ў Мінску спаборніцтвы па мастацкай гімнастыцы такога высокага ўзроўню. Амаль на тыдзень, да 10 лютага, Палац спорту «даў прытулак» адначасова чэмпіянату СССР па мастацкай гімнастыцы ў групавых практыкаваннях і Усесаюзнаму турніру «Алімпійскія надзеі».

Спаборніцтвы сабралі цэлае суквецце славутых імёнаў савецкай гімнастыкі на чале з чэмпіёнкай Еўропы і свету Аляксандрай Цімашэнка. Але ніколькі не разгубіліся ў такой кампаніі беларускія «кветачкі». Толькі чэмпіёнцы яны і ўступілі. А другое і трэцяе месца ў старэйшай групе «Алімпійскіх надзей» занялі мінчанкі — адпаведна Ларыса Лук'яненка і Алена Шаматульская.

Паспяхова выступіла беларуская каманда і на чэмпіянаце СССР у групавых практыкаваннях: зусім крыху не хапіла ёй у барацьбе за «бронзу»— чацвёртае месца ў выніку.

Фота С. ГРЫЦА.

Спецвыпуск рыхтавала Зінаіда АЛЯШКЕВІЧ.

ХОД КАНЁМ

Ліхая бяда — пачатак

Мы ўжо звыкліся з такога роду паведамленнямі. Яны з'яўляюцца ці не штодня: кароткія газетныя радкі абвяшчаюць аб стварэнні новых саюзаў, арганізацый, асацыяцый... Прывыкшы ставіць усё пад сумненне, мы і тут мала верым у эфектыўнасць нованароджанага і заўсёды задумваемся: навошта гэта і якая ад яго карысць?

Прачытаўшы гэту інфармацыю, адкіньце свае сумненні: Фізкультурна-спартыўная Асацыяцыя студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі абавязкова выканае тое, што ўзяла за мэту. Чаму такая ўпэўненасць? А хаця б таму, што студэнты — народ неабыякавы, настойлівы, патрабавальны.

Яны даўно чакалі. Бачылі: студэнцкім спортам апошнім часам амаль ніхто не займаецца. Сёння становішча тут дасягнула крытычнай кропкі — многія страцілі цікаўнасць да фізкультуры і сцвярджаюць, што яна наогул непатрэбна. Але ўявіце, што сталася б з намі — наш багаты на сродкі масавай інфармацыі і прапаганды век і так адвучыў нас ад актыўнага адпачынку, уладкаваўшы вечарамі і выхаднымі днямі ў зручныя мяккія крэслы ля экранаў тэлевізараў. Мы забыліся, што рух — гэта жыццё.

Асабліва варта памятаць гэта студэнтам, якія на працягу пяці гадоў карпеюць на лекцыях і ў чытальцы. Што могуць даць тыя дзве гадзіны ў тыдзень, калі ў раскладзе стаіць фізкультура? Праўда, ёсць яшчэ секцыі. Але звычайна ходзяць сюды тыя, хто хоча чагосьці дасягнуць у спорце. Ды і спартыўныя залы не заўсёды могуць прыняць усіх жадаючых.

Так, праблем шмат. І яны не церпяць адкладвання. Гэта зразумелі і ў Міністэрстве народнай адукацыі БССР, Рэспубліканскім спорткамітэце і Усесаюзным добраахвотным фізкультурна-спартыўным таварыстве прафсаюзаў — яны і сталі заснавальнікамі фізкультурна-спартыўнай Асацыяцыі студэнтаў. Дарэчы, калі вы думаеце, што ідэя яе стварэння ўзнікла раптоўна, то памыляецеся: размова заходзіла аб гэтым даўно. А дамінантай стала нарада фізкультурнага актыву ВНУ, дзе канчаткова зацвердзілі рашэнне.

Асноўная мэта Асацыяцыі — аздараўленне студэнцкай моладзі і развіццё студэнцкага спорту.

На ўстаноўчай канферэнцыі, якая прайшла на мінулым тыдні, быў абраны выканаўчы камітэт Асацыяцыі, у які ўвайшоў і прадстаўнік універсітэта — загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту У. С. Макарэвіч.

Прэзідэнтам Асацыяцыі стаў рэктар БДУ імя У. І. Леніна, член-карэспандэнт АН БССР Ф. М. Капуцкі.

Што ж, ліхая бяда — пачатак. А ён ужо зроблены.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

ЛЮСТЭРКА МНЕ СКАЖЫ...

Суддзі — балельшчыкі

Як паведамляе ТАСС, балгарская газета «Спорт» апублікавала падборку выказванняў вядомых спартсменак — ці пра іх — з розных замежных выданняў. Гэта падборка пра тых, хто не раз удастойваўся журналістамі ці балельшчыкамі тытулаў «самая-самая». Хто ж трапіў у гэты спіс?

Тэнісістка Габрыэла Сабаціні (Аргенціна). Яна названа «самай прыгожай».

Бронзавы загар, чорныя валасы, прыгожыя, гіпнатызуючыя субяседнікаў вочы. Менавіта на ёй у час матча часцей за ўсё затрымліваюцца аб'ектывы тэлекамер — часцей, чым на яе саперніцы ці на самім корце.

Бягуння-спрынтэр Мэрлін Оцці (Ямайка) трапіла ў лік «самых гнуткіх».

Яна, нібы магніт, прыцягвае ўзрушаныя мужчынскія погляды: у яе, у прыватнасці, прыгожыя ногі. Але і ў пачуцці гумару прыгажуні не адмовіш. Калі Мэрлін, напрыклад, спыталі пра яе «вайтлс» (аб'ём бюста, таліі, клубаў), яна імгненна адказала: 100—10—99. І не ўсе адразу зразумелі, што яе ўласны рэкорд на «стометроўцы» — 10,99.

Плаўчыха Крысцін Отта (Германія) — «самая шчаслівая». Аднойчы яна запэўніла, што «рада праводзіць па восем гадзін, трэніруючыся ў басейне. Гэта — і прыгажосць спорту, і гарантыя поспеху». Гэтыя словы былі сказаны Крысцін пасля таго, як яна заваявала шосты залаты алімпійскі медаль на сеульскай Алімпіядзе-88.

Яе зямлячка таксама, плаўчыха і таксама Крэсціна толькі ўжо Кнапэ названа «самай шчырай». «Я цалкам падпарадкоўваюся ў падрыхтоўцы да спаборніцтваў трэнеру, і нават у пытаннях харчавання»,— заявіла спартсменка ў інтэрв'ю французскаму часопісу «Экспресс».

Тэнісістка Штэфі Граф (Германія), як сцвярджаюць балельшчыкі, «самая адзінокая і самая скупая... мільянерша».

— За ўсё патрэбна плаціць,— з роспачу канстатавала спартсменка.— І за поспехі таксама. Дзеля поспеху ў спорце ад многага адмаўляюся. У мяне няма сябровак. Я адзінокая. У Парыжы я нічога не купляла. Цэны там проста жудасныя».

Баскетбалістка Артэнзія Маркары (Бразілія) названа (натуральна, часопісам «Плейбой») «самай сексапільнай». «Плейбой» напісаў пра яе: «У яе твар ангела, грудзі — як баскетбольныя мячы. І доўгія, доўгія ногі...»

КАЛЭНЕЦІКС

УМАЦАВАННЕ ПЛЯЧЭЙ

У палажэнні стоячы выпраміся, расстаў рукі ў бакі на ўзроўні плячэй і павярні іх далонямі наверх. Чым мацней павернеш далоні, тым лепш адчуеш работу мышц. Расслаблена кіруй плечы назад так, быццам хочаш злучыць лапаткі, але толькі на некалькі сантыметраў. Плячыма рухай павольна, не рэзкімі штуршкамі. Галава назад, плечы таксама. Ягадзіцы напружаны, а жывот уцягнуты, але таз трэба выпіхнуць уперад. Выканай гэта 100 разоў. Не згінай локці. Эфект ад гэтага практыкавання — выпрамленыя плечы, больш высокія грудзі і змяншэнне напружанасці мышц паміж лапаткамі і шыяй.

РАСЦЯЖКА ТАЛІІ

Ногі расстаўлены на шырыню адной ступні. Правая рука ўверсе, левая на знешнім баку левай нагі (увага! не на клубе). Выцягніся як мага больш уверх, асабліва правым бокам, правая рука застаецца ўверсе. Нельга нахіляцца і згінаць спіну. Ягадзіцы самкнуты, таз зноў трэба выпіхнуць уперад. Пастой хвіліну ў такой пазіцыі. Нахілі правае плячо ў левы бок (лапаткі трымай прама) так, быццам ты хацела б нешта ўзяць з левага боку са століка. Спіна нацягнута. Выканай 100 разоў двухсантыметровыя рухі ў напрамку да падлогі. Не балансуй клубамі, але расцягвай правы бок цела. Тое ж самае паўтары 100 разоў з левай рукой уверсе.

Ты расцягнеш не толькі талію, але і вобласць падпахаў, пазваночнік і плечы. Таксама зменшацца клубы.

РАСЦЯГВАННЕ КЛУБАЎ

Гэта класічнае, хоць і спрэчнае расцягванне клубаў. Розныя спецыялісты маюць наконт гэтага сваё меркаванне. Таму калі адчуеш боль — не прымушай сябе.

З пазіцыі стоячы нахіліся ўперад на сагнутых каленях і пакладзі далоні на падлогу. З часам гэта можна рабіць з прамымі нагамі. А цяпер выканай толькі тое, што здолееш. Потым мяккa абхапі ногі як мага ніжэй. Акруглі плечы, схавай галаву. Напруж часткі цела паміж лапаткамі. Мякка перасоўвай на 1,5 сантыметры ў напрамку ног увесь корпус. Не адскоквай, як мячык ад сценкі. Перавядзі левую руку на лытку нагі вышэй костачкі. Правую сагні ў лакці. Галаву схавай паміж левай нагой і правым плячом, быццам хочаш паглядзець за сябе. Расцягні мышцы як мага даўжэй. Калі ў цябе гэта атрымаецца — выконвай, пакуль далічыш да 20. Потым адпачывай. Вярніся абедзьвюмі рукамі на падлогу, сагні спіну, як кошка. Тое ж самае паўтары з другой нагі.

ПРАКТЫКАВАННІ ДЛЯ ШЫІ І ПАТЫЛІЦЫ

Павольна апускай галаву на грудзіну, плечы апушчаны, ягадзіцы зжаты, таз — наперад, жывот уцягнуць. З апушчанай галавой выцягнуць шыю наперад і як мага далей. Пратрымайся, пакуль лічыш да 5.

З той жа пазіцыі паднімі абедзьве нагі на 10—15 сантыметраў над падлогай. Паднімі плечы і галаву і перпендыкулярную столі нагу, якую прытрымліваеш рукой. Выцягні ўсю нагу, пальцы таксама, як мага далей. Калі можаш, паспрабуй утрымаць нагу ў вертыкальнай пазіцыі, без дапамогі рук. Рукі выцягні перад сабою, быццам хочаш, каб яны сталі даўжэй на некалькі сантыметраў. Трэба, каб частка спіны і ягадзіцы ляжалі на падлозе.

НОГІ

Ніколі не забывай,што нельга вельмі напружваць ногі празмернымі заняткамі. Пазбягай рэзкіх рухаў, выконвай толькі тое, што можаш, паступова кожны рух будзе простым і лёгкім для цябе.

1. На спінку крэсла, што стаіць трывала, пакладзі мякка абедзьве рукі, пастаўленыя на шырыню плячэй. Стань як мага вышэй на пальцах. Калені сагнутыя і разведзеныя ў бакі, пяткі злучаныя. Хоць і цяжка, паспрабуй выпрастаць спіну і расслабіць плечы. Галаву паднімі. Сцісні ягадзіцы, а таз штурхні наперад так, як толькі можаш. Пратрымайся хвіліну і штурхні таз да максімуму— На сагнутых нагах, трымаючы пяткі разам, апусціся прыкладна на 3 сантыметры. Пагойдайся хвіліну на пальцах.

Паўтары гэта зноў, рухаючы тазам уперад і назад. Зноў апусці цела на 3 сантыметры. Выканай яшчэ раз. Памятай, што плечы трэба трымаць роўна. Цяпер зрабі наадварот: рухі назад-уперад, таксама паднімайся на 3 сантыметры кожны раз. Выканай 3 разы.

2. Ляжыш з паднятымі нагамі. Абхапі клубы і пацягніся ў напрамку каленяў галавой і плячыма. Апусці ногі і трымай рукі выцягнутымі, пры гэтым мякка гойдаючы верхняй часткай цела ўперад-назад, максімальна на 15 сантыметраў у кожны бок. Выканай 100 разоў. Калі ў цябе слабыя ногі, можаш сагнуць калені.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

21 лютага

Зак. 2054.

Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.